SEX=БАЛЯСЫ

# САКРЭТЫ НЕРАЗУМЕННЯ

**Прачытаў нядаўна анекдот, які падаўся не столькі смешным, колькі філасофскім. «Неразуменне — гэта тое, што дазваляе мужчынам і жанчынам захоўваць інтарэс адно да аднаго». Пагадзіцеся, што ў пэўным сэнсе яно сапраўды так і ёсць. Мы розныя, і ў гэтым, мабыць, крыецца галоўная таямніца ўзаемнай увагі. Гэткая пуцяводная нітка, якая вядзе нас па жыцці. Хоць, прызнаемся, зразумець адзін аднаго часам бывае ну-у вельмі складана. («Як кажуць: «мужчына — з Марса, а жанчына — з Венеры». Дык вось, Венера — адзіная планета, якая круціцца супраць гадзіннікавай стрэлкі. Вось тут я і задумаўся пра жаночую логіку...») Думаецца, з-за таго, што мужчыны — істоты найперш лагічныя па сваёй сутнасці, а жанчыны — эмацыянальныя. («Мужчына ад жанчыны чым адрозніваецца? Вытрымкай. Ляжыць жанчына, не вытрымае, ускочыць, мітусіцца, нешта робіць. Мужчына ляжыць сабе далей. Перасільвае».)**

Як слушна гаварыў са сцэны Віталь Каламіец, колішні чэмпіён Вышэйшай Лігі КВЗ у складзе каманды БДУ, «Мужчына — гэта хлопчык, які выпадкова выжыў». Памятаеце: «Сынок, не падыходзь да разеткі!.. Ну... Затое цяпер ты ведаеш, што такое пераменны ток...»? Кіравацца логікай хлопчыкаў з ранняга маленства прывучае само жыццё. («Ты мяне слухаеш увогуле? — Так. — Ну, і пра што я зараз гаварыла? — Пра сваю жаночую лухту, як звычайна. — Добра, гэтым разам табе пашанцавала».) Прынамсі, так было раней. Усведамленне, што пугач пры выпрабаваннях здольны выбухнуць у руках і пальцы паадрываць, што падстаўляць далонь у якасці мішэні для стралы з лука — не самае лепшае рашэнне, прыходзіць тады, калі ўсё ўжо адбылося. («Не бывае позна, бывае ўжо не трэба».)

**«І чаму мужчыны баяцца жанчын? І што можа жанчына зрабіць? Ну, настрой сапсаваць, ну, жыццё паламаць... І ўсё!»**

У дзяўчат жа ўсё павінна быць найперш прыгожа! Любой цаной! («Пяцігадовая дзяўчынка прыходзіць у новай ружовай сукенцы ў дзіцячы сад. На пытанне выхавальніцы, адкуль такая сукеначка, з гонарам адказвае: «Нараўла!») А яшчэ для прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва вельмі важна адчуваць, што яна заўсёды мае рацыю. Нават калі гэта не так. («Мая сёння выдала: «Вось даводзіць да шаленства спрэчка з табой! У цябе проста аргументаў больш, з-за гэтага падаецца, што быццам ты маеш рацыю! А ты не маеш рацыі!!!»») Ну, і вядома, шопінг! («Дзяўчына не можа быць шчаслівай, пакуль не абзавядзецца дастатковай колькасцю адзення, якое можна не апранаць».) Вось мы, прадстаўнікі іншай паловы чалавецтва, усё ж пра гэта ведаем. І ў большасці выпадкаў — не разумеем. Дакладней, разумеем, што гэта непаразуменне. («Мужчыны, не спрабуйце зразумець жанчын. Мала таго, што яны часам мыюць галаву асобна ад цела, дык некаторыя яшчэ і грыўку мыюць асобна ад усёй галавы».) І тым не менш мы «вядзёмся», цягнемся адно да аднаго, як за той пуцяводнай ніткай. Прымаем правілы гульні, спадзеючыся, што зможам падмануць «сістэму». («І чаму мужчыны баяцца жанчын? І што можа жанчына зрабіць? Ну, настрой сапсаваць, ну, жыццё паламаць... І ўсё!») Галоўнае, не палохацца, і ўдача абавязкова ўсміхнецца вам!



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Хоць, трэба прызнаць, неразуменне можа спрацаваць «на інтарэс», толькі калі яно сапраўды ў меру. («Усё! Заўтра кардынальна мяняю сваё жыццё!!! — Ляжаш на тэлевізар і будзеш глядзець на канапу?») Нядаўна жыхар Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў вырашыў скасаваць шлюб з жонкай адразу пасля таго, як атрымаў магчымасць убачыць яе твар без макіяжу. Пара адпачывала на пляжы і 24-гадовая жанчына змыла «расфарбоўку», каб паплаваць. Муж быў шакіраваны непрывабнай знешнасцю сваёй палавінкі. Высветлілася, што тая зрабіла мноства пластычных аперацый, сляды якіх сталі заўважныя на твары, апроч таго, яна насіла каляровыя кантактныя лінзы і накладныя вейкі. 30-гадовы мужчына палічыў сябе падманутым і катэгарычна адмовіўся прымірыцца з жонкай. Тая быццам бы збіралася ўсё расказаць мужу, але зацягнула з гэтым. Дарэчы, пара да заключэння шлюбу была паўгода ў заручынах. («Як прайшла першая шлюбная ноч? — Не ведаю, я страціў прытомнасць адразу пасля таго, як яна адклеіла накладныя вейкі...»)

Бываюць яшчэ больш клінічныя выпадкі. Мікіту Джыгурдзе не дапамагло ні галенне барады, ні ўзятае новае мудрагелістае імя, ні абяцанне тварыць далей у «любові без правілаў». Марына Анісіна, яго жонка, нарэшце вырашыла скасаваць шлюб, назваўшы эпатажнага мужа — ні многа, ні мала — хворым. («Акей, гугл! Як адрозніць прынца на кані ад вершніка апакаліпсіса?») Шмат жа ёй спатрэбілася часу, каб зразумець гэта... («Даведаліся адно пра аднаго бліжэй і паслалі адно аднаго як мага далей».) Наўздагон падзеі толькі і застаецца што сказаць Джыгурдзе: «Кінула жонка? Не пабіўся, і тое добра»...

...У мяне ёсць світар, які праблематычна нацягнуць на сябе аднаму: рукавы скручваюцца. Я жартую, што такія нельга прадаваць адзінокім мужчынам. На дапамогу кожны раз прыходзіць якраз жонка, без лішніх слоў выпростваючы іх. («У адносінах галоўнае, каб абодва любілі шаўрму».) Памятаеце словы адной песні Ганны Герман? «Надзея — мой компас зямны, а ўдача — узнагарода за смеласць»? Дык вось, зычу кожнаму правільнага азімута па жыцці і сваю Надзею.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «МЫ НЕ «ДЫНАЗАЎРЫ»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Косця, можна сказаць, што ў цябе класічная школа вакалу. Ты вучыўся ў Пятра Ялфімава, перамагаў на многіх міжнародных конкурсах, а тут раптам — метал-праекты!***

**Канстанцін:** — Вучыцца спяваць я пачаў толькі пасля таго, як стаў металістам *(смяецца)*. Ды і з Пятром мы пазнаёміліся дзякуючы такой музыцы, падчас адной з вечарын у падтрымку маладых гуртоў, яшчэ ў пачатку 2000-х.

***— З Пятром цяпер часта выступаеце, сябруеце?***

**Канстанцін:** — І сябруем, і часам выступаем разам. І сяброўства, канешне, звязанае з сумеснай творчасцю. Ды і Пётр, які, здавалася б, мае кансерваторскую адукацыю, сам педагог, па сутнасці з'яўляецца металістам. Ды ён і пазіцыянуе сябе хутчэй як рок-выканаўца.



**Дзмітрый:** — Сёлета Пётр разам з намі выступаў падчас канцэрта ў клубе Re:Public. У нас нават атрымалася зняць якаснае відэа, запісаць якасны гук. Думаю, у хуткім часе мы гэты запіс прадставім публіцы.

***— Не так даўно ў гурце з'явіліся аж тры новыя музыканты, маладыя. Як іх прыход паўплываў на калектыў?***

**Дзмітрый:** — Змянілася ўсё толькі ў лепшы бок. Мы цяпер сталі больш цэльнай камандай. І па духу, і па кірунку мыслення. Усе хлопцы маюць вышэйшую музычную адукацыю, багаты вопыт і вельмі любяць такую музыку. Выдатна, што ў камандзе зараз спалучаецца і жаданне нешта зрабіць, і высокі прафесіяналізм выканання. Таму працуем над новым матэрыялам, і творчасць зрушылася з мёртвай кропкі, на якой мы доўгі час знаходзіліся. Цяпер для нас — ідэальны перыяд у творчасці, бо не даводзіцца разглядаць стары матэрыял. Хлопцы вельмі хутка вывучылі ўвесь рэпертуар, таму рэпетыцыі прысвячаем толькі стварэнню новых кампазіцый.

**Канстанцін:** — Цікава атрымалася, што сёння студэнты музычных ВНУ класічны рок успрымаюць як нешта хрэстаматыйнае, вартае вывучэння. Менавіта такія хлопцы прыйшлі ў гурт, і нават настрой у кампаніі стаў лепшы. Калі раней нас аб'ядноўвалі пэўныя навыкі, стылістычны падыход, але мы былі рознымі людзьмі і па ўзросце, і па светаўспрыманні, то сёння і ўзроставы баланс, і адзінства пogляду захоўваецца.

***— Слухачам ужо нешта новае прадстаўлялі, створанае менавіта ў такім складзе?***

**Дзмітрый:** — Не так даўно выпусцілі новую песню «Насустрач вятрам», ідзе работа яшчэ над некалькімі кампазіцыямі. Таксама запісалі два канцэрты, адзін з іх ужо прадстаўлены ў інтэрнэце, а другі думаем прэзентаваць у вельмі цікавай анлайн-форме з магчымасцю абмеркавання разам са слухачамі. Паколькі мы не так многа выступаем у іншых гарадах, але часта чуем просьбы правесці канцэрты, то такая інтэрнэт-прэзентацыя будзе хутчэй для іх, каб адчаваць атмасферу канцэртнага выступлення.

***— Цяпер продаж дыскаў для многіх гуртоў, ды і для вашага, мяркую, таксама не з'яўляецца крыніцай заробку. Менавіта таму вы не супраць, што песні гурта з'яўляюцца ў інтэрнэце ў свабодным доступе?***

**Дзмітрый:** — Мы самі іх прапаноўваем для бясплатнага спампоўвання і пацвярджаем, што далі дазвол для праслухоўвання. Прытым прапануем слухачам трэкі ў высокай якасці. А дыскі сапраўды прадаём за сімвалічныя грошы ці дорым. Гэта магчымасць для фанатаў, якія хочуць падтрымаць гурт.

**«Сёння студэнты музычных ВНУ класічны рок успрымаюць як нешта хрэстаматыйнае, вартае вывучэння».**

**Канстанцін:** — Многія слухачы набываюць дыскі толькі дзеля калекцыі, ім падабаецца іх збіраць. Ёсць нават прыхільнікі, якія маюць усе рэлізы, што мы некалі рабілі, на дысках. Гэта вельмі прыемна. Але, напэўна, мы прайшлі пэўны этап, калі, наглядзеўшыся фільмаў пра Metallica, Iron Maiden, таксама марылі, што будзем ездзіць у вялікія туры. Магчыма, такое некалі і здарыцца. Але калі гэтага не будзе — нічога страшнага. У нас свой шлях, свае прыхільнікі і канцэрты. Гэта таксама выдатна.

***— А хто вашы класічныя фаны?***

**Канстанцін:** — Ёсць вельмі маладыя людзі, якія, магчыма, толькі нядаўна даведаліся пра існаванне нашага гурта. А ёсць і «старажылы», якім за 40.

**Дзмітрый:** — Падчас выступлення на фестывалі «Наш Грунвальд» я пад сцэнай заўважыў хлопца ў майцы з выявай рэпера Eminem і вельмі здзівіўся, калі ён спяваў разам з намі амаль усе песні. Слухачы вельмі розныя. Але ёсць адна рыса, якая іх аб'ядноўвае, — вялікая любоў да нашай творчасці, песень. Таму калі Косця аддае мікрафон у залу, усе з задавальненнем спяваюць. Нават калі граем абсалютна новую песню, якую выклалі літаральна за некалькі дзён да канцэрта, усё роўна публіка паспявае яе вывучыць. Гэтая адданасць дарагога вартая.

***— Вы не крыўдуеце, калі нехта ў вашай музыцы знаходзіць падабенства з іншымі камандамі? Згадаю класічны варыянт параўнання з праектам «Кіпелаў».***

**Дзмітрый:** — Падабенствы можна знайсці заўсёды. Кожны гурт грае тое, што блізка па духу, і зразумела, што ўсе некалі ўвабралі шмат ад заснавальнікаў стылю. Без сумнення, недзе такое выказванне будзе справядлівым. Але ж ключавым момантам для гурта з'яўляецца іх матэрыял. Ён або падабаецца людзям, або не. Можна напісаць шмат класных песень, падобных на нечыя, і іх палюбіць публіка, а можна зрабіць унікальную музыку, якая нікому не будзе патрэбнай. Мы робім стаўку на пошук цікавага матэрыялу — гармоній, мелодый, рытмаў.

**«Падчас выступлення на фестывалі «Наш Грунвальд» я пад сцэнай заўважыў хлопца ў майцы з выявай рэпера Eminem і вельмі здзівіўся, калі ён спяваў разам з намі амаль усе песні».**

***— Над чым цяпер працуеце?***

**Дзмітрый:** — Над сінглам «Эра чорных люстэркаў». Гэтая песня часткова пераклікаецца з канцэпцыяй серыяла «Чорнае люстэрка». Магчыма, калі паспеем, прэзентуем яго яшчэ да Новага года. Наўмысна стараемся, каб тэмы песень былі актуальныя і неслі моцны пасыл слухачу.

**Канстанцін:** — Паспрабуем адысці ад кананічных прыёмаў металу — героікі, эпікі, пафасу, драконаў. Не скажу, што ў нас такое было, але хочацца пазбягаць штампаў. Мы не «дыназаўры», жывём у сучаснасці, таму ад «старажытных» рысаў будзем пазбаўляцца. Мне падаецца, што шчырая творчасць будзе знаходзіць водгук у сэрцах і розумах людзей. Менавіта такую музыку мы і робім.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*



ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 02.11.2016 г.